14. *Erman A., Grapow H.* Wörterbuch der aegyptischen Sprache. Leipzig, 1955. . Bd. I–V.
15. *Gardiner A.* Egyptian Grammar. Cambridge, 2005.
16. *Lepsius C.* R Denkmaeler aus Aegypten und Aephiopien. Berlin, 1849 – 1859. Denkmaeler des Neuen Reichs, Abtl. III, Bl. 22.
17. Liddell Henry George, Scott Robert. A Greek-English Lexicon. Oxford,1996. P. 1196
18. *Montet P.* Geographie de L'Egypte Anciennne. Paris, 1957.
19. *Sethe K.* Urkunden der 18. Dynastie. Leipzig, 1906. . Zweiter Band. IV.
20. *Shaw I.,* Nicholson P. The Dictionary of Ancient Egypt. NY., 2003. P. 208.
21. *Shaw I.* The Oxford History of Ancient Egypt. NY, 2000.

# АРГАНІЗАЦЫЯ КІРАВАННЯ НАЛІБОЦКАЙ ПУШЧАЙ У XVIII СТ.

**Дз. С. Крывашэеў**

Усе радзівілаўскія лясы, што ляжалі ў межах Наваградскага і Менскага ваяводстваў, а таксама Ашмянскага і Лідскага паветаў Віленскага ваяводства, складалі адно вялікае лавецтва. Яно не мела дакладнай назвы, і лоўчы гэтых пушчаў перыядычна тытулаваўся то як «лоўчы пушчаў Наднёманскіх, Налібоцкіх, Дакудаўскіх (сёння – в. Дакудава Лідскага раёну), Койданаўскіх і іных» [4, арк. 22], то як «лоўчы пушчаў Занёманскіх і Наднёманскіх» [3, арк. 76адв.], а часам і проста «лоўчы пушчаў, што ляжаць у ваяводствах Менскім і Наваградскім, у паветах Ашмянскім, і Лідскім» [3, арк. 2]. Гэтае вялікае лавецтва, ў сваю чаргу, падзялялася на цэлы шэраг падлавецтваў: Мірскае, Нясвіжскае, Ліпічанска-Беліцкае (сёння – в. Ліпічанка Шчучынскага раёну, в. Беліца Лідскага раёну), Ляхаўска-Ленінска-Чучэвіцкае, Койданаўскае, Дакудаўскае, Дзяляціцкае (сёння – в. Дзяляцічы Навагрудскага раёну), Налібоцкае, Дзераўноўскае (сёння – в. Дзераўное Стаўбцоўскага раёну), Хотаўскае (сёння – в. Хотава Стаўбцоўскага раёну), Аталезкае (сёння – в. Аталезь Стаўбцоўскага раёну) і інш. На чале кожнага падлавецтва стаяў асобны падлоўчы. Падлавецтвы, ў сваю чаргу, падзяляліся на стражы, дзе неслі варту стральцы.

Лясной справай ва ўсіх радзівілаўскіх землях загадваў генеральны лоўчы. Яго рэзідэнцыя месцілася ў Нясвіжы. Адсюль ён рассылаў шматлікія загады і распараджэнні, вёў перапіску з лоўчымі і падлоўчымі. У адной інструкцыі ён названы як «генеральны камісар пушчаў, псяроў, і гушчароў, таксама псярняў». Яго сувязь з лоўчым трымалася на штомесячнай справаздачнасці апошняга. Сам генеральны лоўчы на аснове атрыманых ад падначаленых звестак рэгулярна рыхтаваў рапарты і калькуляцыі для Радзівіла [3, арк. 2адв., 59–61адв.].

Занёманскі і Наднёманскі лоўчы меў сваю рэзідэнцыю ў Налібоках [3, арк. 9]. Асноўная яго функцыя заключалася ў кіраванні падлоўчымі,

стральцамі і ляснікамі, вызначэнні месцаў нясення іх службаў [3, арк. 2–4, 76адв.–78]. У абавязкі лоўчага ўваходзіла сачыць за лесам і не дазваляць няслушных пасечак у гаях, пільнаваць і абараняць панскія ловы, дбаць аб захаванасці і памнажэнні рухомай і нерухомай маёмасці Радзівілаў, кантраляваць распрацоўку таварнага дрэва і яго продаж, збіраць асобныя падаткі ў межах лавецтва і інш. У Налібокі штотыдзень ад бліжэйшых і штомесяц ад дальніх падлоўчых паступалі адмысловыя рапарты аб справах і здарэннях у пушчах. Нягледзячы на гэта, лоўчы быў павінен на свае вочы агледзець кожную пушчу – штомесяц здзяйсняць аб'езд бліжэйшых і кожныя тры месяцы аддаленых падлавецтваў. Пад час такіх рэвізій правяралася выкананне падлоўчымі, стральцамі, баброўнічымі і бортнікамі сваіх службовых абавязкаў [3, арк. 2–4].

Налібоцкі падлоўчы быў паселены ва ўрочышчы Бродным пад Налібокамі; дзераўноўскі – у Наднёманскай Слабадзе (сёння – в. Сіняўская Слабада Карэліцкага раёну); хотаўскі жыў у Ляўкоўшчыне (сёння – в. Стаўбцоўскага раёну). Яны павінны былі рэгулярна, штотыдзень, аб'язджаць лясныя прадпрыемствы – буды, аглядаць стан і сачыць за ходам працы на іх, кантраляваць выкананне стральцамі павіннасці па ахове пушчаў [3, арк. 9–10].

Але не ўсе падлоўчыя сумленна выконвалі сваю працу, часам сустракаліся вельмі сур'ёзная парушэнні і злоўжыванні з іх боку. Часта яны ішлі на адкрытыя злачынствы супраць ардынацкай маёмасці, найперш лясоў, палёў, сенажацяў і таварнага дрэва. За пэўны хабар, які мог быць ў выглядзе грошаў, гарэлкі, аўса ці солі, падлоўчы мог дазволіць мясцовым сялянам, мяшчанам ці шляхце, высякаць і прадаваць лес, браць бярвёны для будавання хатаў, дазваляць расчыстку поля для арганізацыі пасекі, альбо незаконнае паляванне ў радзівілаўскіх ловах [3, арк. 159–159адв.].

Штат службоўцаў і малодшых ураднікаў лавецтва складаўся са стральцоў, бортнікаў, асочнікаў, леснікоў, а таксама служкаў без пэўнага профілю – усяго на 1778 г. 32 чалавекі. Але два з іх сумяшчалі бортніцкую і асочніцкую службы, што было даволі шырока распаўсюджана па тым часе [2, с. 133]. З 32 службоўцаў 15 чалавек ці 17 службаў прыходзіліся на Налібоцкае падлавецтва: 8 стралецкіх, 5 бортніцкіх, 2 асочніцкіх і 2 лясніцкіх. 10 чалавек служылі ў Дзераўноўскай пушчы: 6 стральцоў, 3 бортнікі і 1 ляснік. У Хотаўскім падлавецтве іх налічвалася найменш за ўсё – 3 стральцы, 1 бортнік, 1 ляснік і 2 чалавекі без пазначэння профілю абавязкаў [3, арк. 9–9адв.].

У Налібоцкай, Дзераўноўскай, Хотаўскай пушчах было вызначана 10 месцаў для стралецкай стражы. Яны размяшчаліся пераважна ва

урочышчах блізу найбольш каштоўных бароў і на буйным лясным гасцінцы з Гнесічаў (сёння – вёска Навагрудскага раёну.) на Налібокі [3, арк. 9].

Стральцы неслі варту ў найдрабнейшых адміністрацыйных лясных адзінках – стражах. Цэнтрам стражы была буда. Але стража магла буды і ня мець. Стральцы неслі варту ўдвох. Праз тыдзень іх мянялі іншыя стральцы. Калі будаў наўкол не было, то тыя проста абыходзілі адведзены ім для пільнавання кавалак лесу. Сваю службу яны неслі конна ці пешшу, у залежнасці ад пастаўленай задачы. Стральцы, па загадзе падлоўчых, кантралявалі правы сялян на ўваходы ў пушчу. Дазвалялася пушчаць да лесу толькі тых, хто меў адмысловы на гэта дазвол – «квіт» альбо білет. Такія білеты ён мусіў збіраць і ў канцы месяца здаваць да падлоўчага, які рабіў агульную калькуляцыю ўсіх атрыманых ад стральцоў квітоў і білетаў для падрыхтоўкі рапарту для лоўчага. Кожнае падлавецтва мела білеты свайго колеру з адмысловым малюнкам. Стральцы таксама займаліся адловам лісянят і ваўчат для радзівілаўскіх звярынцаў і інш. [3, арк. 2адв., 10]

Сярод стральцоў былі вайсковыя званні, у прыватнасці званне паручніка [3, арк. 36]. Узбраенне стральца, ці, як яго часам называюць дакументы, мысліўца, складалася з гусарскага палашу, якія адмыслова закупляліся для гэтай патрэбы ў Караляўцы, і пісталета. Для іх шылася з сукна спецыяльная стралецкая форма. Радзівілы пільна сачылі за тым, каб тыя былі аднолькава апрануты і добра ўзброены [3, арк. 53–53 адв.].

Стралецкую службу неслі як прадстаўнікі збяднелай шляхты, так і выбраныя для гэтага сяляне [3, арк. 36]. Яны ўмела абыходзіліся са зброяй і лічыліся вельмі трапнымі стралкамі. Менавіта па гэтай прычыне ў 1794 г. па загадзе Т. Касцюшкі пачалі набіраць спецыяльныя стралецкія пешыя палкі. Іх узбраенне адрознівалася ад рыштунку радзівілаўскіх лясных стральцоў. А палашамі, якія былі на ўзбраенні радзівілаўскай стралецкай стрыжы, ў войску ВКЛ таго часу былі ўзброены так званыя паштовыя – шэраговыя кавалерысты нешляхетнага паходжання [1, с. 53].

Стралецкая, як асочніцкая і лясніцкая службы часта мелі дынастычны характар, то бок магла перадавацца ад бацькі да сына, а часам і ўсе дарослыя мужчыны ў сям'і былі асочнікамі ці стральцамі [3, арк. 185].

Асочніцкую службу, як лясніцкую і бортніцкую, неслі выключна сяляне. Яны, як і пяцьсот год таму, займаліся высочваннем звяроў у лясах, сачылі за звярынымі пераходамі і месцамі найбольш прыдатнымі для палявання. Разам з іншымі службоўцамі прымалі ўдзел у княжацкім паляванні і інш. [4, арк. 30–31адв.]

Ляснікі, бліжэйшыя памагатыя стральцоў, павінны былі мець для

выканання свайго абавязку стрэльбу. У іх абавязкі ўваходзіў адстрэл для патрэбаў радзівілаўскага скарбу лясных жывёл і пільнаванне адведзенага ім кавалку пушчы [3, арк. 76адв.]. Выкананне лясніком яго службовых абавязкаў 6–7 разоў на год правяраў падлоўчы. Апошні разам з лясніком абыходзіў ляснiцкую дзялянку і правяраў стан спраў на месцы. Кожная такая інспекцыйная праверка фіксавалася падлоўчым кароценькай нататкай і ўласным подпісам у спецыяльнай «кніжачцы для ляcніка». Інспекцыі падлоўчых да ляснікоў пачашчаліся пад час паляўнічага сезону – позняй восенню і ўзімку, калі парушэнні былі найбольш верагодныя [4, арк. 7–10]. Самі ляснікі неслі рэгулярную варту сваёй тэрыторыі, дзе аглядалі стан таварных гаёў і паляўнічых угоддзяў: звярыных ловаў, цецеруковых токаў і месцаў палявання на фазанаў.

Бортнікі, што таксама знаходзіліся ў прамым падпарадкаванні падлоўчых, павінны былі даглядаць скарбовыя борці, асаджаць новыя, сачыць за пасекамі. У дагляд за борцямі і вуллямі-калодамі ўваходзілі збор мёду і воску, падрыхтоўка вулікаў да зімоўкі і інш. Дакументы таксама згадваюць баброўнічых, якія даглядалі за радзівілаўскімі бабровымі гонамі, ажыццяўлялі адлоў баброў, выдраў і норак для радзівілаўскіх звярынцаў і кухні [3, арк. 70–70адв.].

Пасля першага падзелу Рэч Паспалітай Радзівілы згубілі свае лясныя валоданні ва усходняй частцы ВКЛ, што павінна было істотна пахіснуць лясную гаспадарку. Прыблізна на пачатку 80-х гг. XVIII ст. (дакумент не магчыма датаваць дакладна) быў складзены план рэфармавання лясной галіны гаспадарання. У адпаведнасці з «Генеральным падзелам лясоў», складзеным, па ўсёй верагоднасці, пасля 1780 г., ва ўсіх радзівілаўскіх пушчах планавалася правесці ўніфікацыю гаспадарча-адміністрацыйнага дзялення – былое вялікае «Занёманскае і Наднёманскае лавецтва» падзяліць на больш дробныя аддзелы: 1. Нясвіжскі, што размяшчаўся паміж Копылем і Беліцай (сёння – в. Гродзенскай вобласці на р. Нёман); 2. Дубінскі – паміж Біржамі і ашмянскімі лясамі; 3. Слуцкі; 4. Менскі, які таксама меў назвы Койданаўскі і Беліцкі, альбо Наднёманскі; 5. Альцкі; 6. Бельскі; 7. Заблудаўскі.

Налібоцкая пушча размяшчалася ў адпаведнасці з гэтым планам ў Менскім аддзеле і займала яго асноўную частку. Былы падзел на падлавецтвы меркавалася замяніць на ляснiцтвы. На чале ляснiцтва стаяў ляснік. Лясніцтвы складаліся са стражаў на чале са стражнікамі, а стражы – з стралецтваў. Колькасць усіх службоўцаў дакладна рэгламентавалася. Кожнаму службоўцу налічаўся фіксаваны заробак [5, арк. 95]. Але, на вялікі жаль, гэты праект не быў рэалізаваны цалкам.

**Літаратура**

1. *Грыгор'еў М.* Войска ВКЛ ад Сасаў да Касьцюшкі (1765–1794). Мн., 1994.
2. *Доўнар А.Б.* Сяляне-слугі Беларусі другой паловы XVI – сярэдзіны XVIII ст. Мн., 2007.
3. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі (далей – НГАБ). Ф. 694. Воп. 3. Спр. 1212.
4. НГАБ. Ф. 694. Воп. 3. Спр. 1215.
5. НГАБ. Ф. 694. Воп. 3. Спр. 1217.

# ЭКАЛАГІЧНЫ РУХ У ФРАНЦЫІ (1984 – 1995 ГГ.)

**В. С. Леўшык**

Экалагічныя арганізацыі ў Францыі пачалі з'яўляцца ў пачатку 1970-х гадоў і першапачаткова ўспрымаліся як палітычная экзотыка. Гэтыя арганізацыі з'яўляліся монатэматычнымі. Іх праграмы звычайна датычыліся праблем экалогіі, а па астатнім пытаннях яны толькі крытыкавалі існуючую палітычную сістэму. Пад час першай выбарчай кампаніі – прэзідэнцкіх выбарах 1974 года – на якой экалагісты мелі свайго прадстаўніка Р. Дзюмона, яго падтрымлівалі шматлікія экалагічныя арганізацыі рознага кшталту, такія як праціўнікі выкарыстання ядзернай зброі, ахоўнікі навакольнага асяроддзя, абаронцы трэцяга свету, натуралісты і інш. Далей пад рознымі назвамі («Экалогія-78», «Еўропа – Экалогія», «Экалогія сёння» і інш.) гэтыя арганізацыі ўдзельнічалі ў муніцыпальных, парламенцкіх, прэзідэнцкіх выбарах. Фактычна, усе яны былі адкрытымі, самакіруемымі і дэцэнтралізаванымі і, трэба адзначыць, што і прапановы гэтых арганізацый значна адрозніваліся, што таксама патрабавала нейкага абагульнення: [8, p.176].

У лістападзе 1983 года для абмеркавання сітуацыі і магчымасцей далейшага аб'яднання шэраг экалагічных арганізацый з'ехаліся на асамблею. Але толькі дзве з іх паўторна сустрэліся 28 і 29 студзеня 1984 года ў Клішы, дзе адбылася генеральная асамблея. Пад час сустрэчы гэтыя два рухі – «Партыя экалагістаў» і «Канфедэрацыя экалагістаў» – аб'ядналіся. Новая арганізацыя называлася «Зялёныя, Канфедэрацыя экалагістаў – Партыя экалагістаў» (Les Verts, Confédération écologiste – Parti écologiste). Але звычайна выкарыстоўваецца толькі першая частка назвы – «Зялёныя»: [1, p.10]

Партыя Зялёных з 1984 па 1995 гг. прайшла доўгі і складаны шлях. За гэты перыяд двойчы змянялася яе палітычная лінія і лідэры. Згодна з асноўнымі падзеямі ў арганізацыі, яе дзейнасць можна падзяліць на тры перыяды.